# СВАБОДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

№ 31(80),16-22. 08. 2007 г.


# КАРОЛЬ ПАЛЁЎ

## ПАСЛЯ ЦЫБУЛІ ЎЗЯЛІСЯ ЗА КУКУРУЗУ




Аляксандр Лукашэнка паабяцаў, што датацыі стратным сельгаспрадпрыемствам будуць спыненыя з 2010 году. Ці гэта новая эканамічная палітыка? Ці блеф?

Калгасы і саўгасы для Лукашэнкі заўжды былі фетышам. Падтрымка аграрнага комплексу і сёння застаецца беспрэцэдэнтнай: на праграму адраджэння сяла ашчаджана 69 трыльёнаў рублеў. І раптам...

У мінулую пятніцу падчас візіту на Гродзеншчыну Лукашэнка заявіў, што ў будучыні фінансаванне сельскай гаспадаркі плануецца паступова скарачаць. “Паступова” – гэта мякка сказана. Ужо з 2008 году датацыі будуць скарочаныя напалову, а яшчэ праз год – зліквідаваныя наогул.

Тых, хто не здолее прыстасавацца да новых эканамічных умоваў, Лукашэнка асудзіў на “галодную смерць”: «Пусть погибают! 13 лет их на своих плечах носим. Хватит уже».

У назіральнікаў адразу ўзнікла думка: няўжо кіраўнік Беларусі нарэшце зразумеў бесперспектыўнасць датацый для сельскай гаспадаркі? Колькі туды грошай ні дай – усё знікне, нібы ў “чорнай дзірцы” – гэта было відавочна даўно. Аднак Лукашэнка ўпарта рабіў стаўку на аграрны комплекс, спасылаючыся на неабходнасць забяспечыць прадуктовую бяспеку дзяржавы. І вось цяпер што ж? Ён ускосна прызнаў сваю памылку?

На жаль, не. Гутарка ідзе толькі пра сто першае кітайскае папярэджанне калгасам і саўгасам, якія прызвычаіліся існаваць на субсідыі, атрыманыя з бюджэту. А магчымасці казны паступова змяншаюцца. Таму, калі раней Лукашэнка мог па-барску кінуць вёсцы неабходную колькасць грошай, цяпер ён мусіць гэтыя самыя грошы лічыць. І абяцаць пакінуць без апекі “дармаедаў”, якія дагэтуль не навучыліся зарабляць сабе на існаванне.

Аднак такіх “дармаедаў”, нават паводле афіцыйных падлікаў, — 75-80% ад агульнай колькасці сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Вы можаце ўявіць сабе, што праз два гады кожныя 4 з 5 калгасаў сканаюць? Я – не.

Лукашэнка проста палохае кіраўнікоў сельскіх гаспадарак, якія па-ранейшаму застаюцца “чырвонымі памешчыкамі”. А тым не страшна. Бо яны цудоўна разумеюць: 2010 год – передвыбарны. І ўлада знойдзе грошы для сельскай гаспадаркі ў кожным выпадку. Пазычыць у Масквы, Уга Чавеса, чорта лысага – але знойдзе. Бо інакш яе чакае сацыяльны выбух і відавочнае банкруцтва эканамічнай мадэлі.

**Працяг на стар.4**

## КАЛІ ЗАЎТРА ВАЙНА

### АГЛЯД ДЗЯРЖАЎНАЙ ПРЭСЫ

НА СТАР. 6

## ПРАКЛЯТЫЯ ПАЭТЫ

### ЭСЭ АЛЕГА АБЛАЖЭЯ

НА СТАР.7

# ЦІ НА КАРЫСЦЬ БЕЛАРУСІ ПРЫЯРЫТЭТНАЕ Ў АДНОСІНАХ ДА ІНШЫХ КАНФЕСІЙ СТАНОВІШЧА РУСКАЙ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ?

**АЛЕГ ДАШКЕВІЧ, РЭЖЫСЁР:**

## “ПАВІННА БЫЦЬ БЕЛАРУСКАЯ АЎТАКЕФАЛІЯ”

Праваслаўнай царквы – так. Рускай – не. Праваслаўнае не ёсць толькі рускім. І праваслаўе існуе па-за межамі нацыянальнага. А РПЦ у сённяшнім выглядзе пераследуе выключна свае нацыянальныя расійскія інтарэсы. Тым больш, у дачыненні да іншых краінаў. У ідэале павінна быць беларуская аўтакефалія з прыярытэтным становішчам. У сувязі з тым, што пераважная большасць беларусаў арыентуецца на праваслаўе. Больш за 50 працэнтаў. А праваслаўе ў цяперашнім выглядзе – гэта рычаг русіфікацыі. І прасоўвае інтарэсы Расіі ў культурным і духоўным полі.

**КАНСТАНЦІН, МЕНЕДЖЭР:**

## “СВЯТАРЫ ПЕРАТВАРЫЛІСЯ Ў ЧЫНОЎНІКАЎ”

Прыярытэтнае становішча хоць чаго не можа ісці камусьці на карысць. Манаполія ператварае любую актыўнасць у кантору. Мы назіраем такое ператварэнне цудоўнай канфесіі, якая нясе агромністую духоўную традыцыю апостальскую... Але гэтага ўсяго не бачна за фасадам канторы. Дзякуючы вось гэтым прывілеям святары ператварыліся ў кабінетных чыноўнікаў. Напэўна, ёсць у нашай частцы РПЦ і цудоўныя прыходы, і цудоўныя святары, і цудоўная паства. Але за фасадам канторы іх становіцца бачна ўсё меней і меней.

**АЛЕСЬ СМАЛЯНЧУК, ГІСТОРЫК:**

## “НЕЛЬГА ПАРУШАЦЬ РАЎНАВАГУ”

Лічу, што не на карысць. Беларуская гісторыя -- гэта гісторыя пераважна памяркоўнай зямлі, дзе ўжываюцца розныя канфесіі. Такія традыцыі нельга ламаць. Трэба шанаваць і берагчы. Я нядаўна вярнуўся з экспедыцыі на Браслаўшчыну, дзе мы працавалі ў вёсках. Там жывуць і праваслаўныя, і каталікі, і стараверы. І людзям вельмі цяжка было ўзгадаць, хоць мы і спрабавалі выцягнуць гэтую праблему, нейкія міжканфесійныя сутыкненні, канфлікты. Практычна нічога такога не было. Праваслаўныя ходзяць да каталікоў, калі няма праваслаўнага храма, каталікі — да праваслаўных. А вось сёння высоўванне і прыярытэт адной царквы можа парушыць тую раўнавагу, якая складалася стагоддзямі.

**УЛАДЗІМІР МАЦКЕВІЧ, ФІЛОСАФ:**

## “ПЫТАННЕ РЫТАРЫЧНАЕ”

Вядома, што пытанне рытарычнае. Канечне, не на карысць. Увогуле, любы пратэкцыянізм у канфесійных справах не на карысць не толькі тым, хто пазбаўлены гэтай пратэкцыі, але ж і для тых, каму гэтая пратэкцыя робіцца. У прыватнасці, праваслаўю. У гэтым сэнсе Руская праваслаўная царква за апошнія гады амаль спынілася ў сваім развіцці. Таму што ім не патрэбныя ні абнаўленні, ні нейкія там рэфлексіі, спрэчкі. Увогуле няма руху. Тое, што не рухаецца, патроху заплывае тлушчам. Становіцца груваскім і непаваротлівым. Гэта тое, што тычыцца самой структуры РПЦ. Па-другое, РПЦ мае цэнтр у Расіі і пры традыцыйных адносінах праваслаўнай царквы з дзяржаваю (гэтыя адносіны называюцца сімфоніяй з часоў Візантыйскай імперыі) – гэта сугучнасьць свецкіх і царкоўных уладаў. Таму РПЦ сугучная крамлёўскім уладам. А да беларускіх праблемаў яна абыякавая. Зараз, калі супярэчнасці паміж Расіяй і Беларуссю выявіліся на ўзроўні нашага рэжыму, стала відавочным, што прыярытэт, які надаецца праваслаўнай царкве, ёсць анахранізмам і недарэчнасцю. Яна павінна быць выпраўленая.

**ВОЛЬГА, БУХГАЛТАРКА:**

## “НЕ БАЧУ НІЧОГА КЕПСКАГА”

Не бачу ў гэтым нічога кепскага. Бо калі пачынаюцца адміністратыўныя спрэчкі, сканчаецца духоўнасць. Паколькі большасць насельніцтва рэспублікі лічыць сябе праваслаўнымі, дык чаму б праваслаўю не мець прыярытэтнага становішча? Гэта ж не значыць, што астатнім канфесіям будзе ад гэтага горш. Хай займаюцца справамі духоўнымі, а не палітычнымі.

**ЖАННА, СТУДЭНТКА:**

## “НАША ПЕРАВАГА Ў ШМАТКАНФЕСІЙНАСЦІ”

Адна з перавагаў Беларусі ў яе шматканфесійнасці. Я, напрыклад, увогуле не магу вызначыцца са сваёй верай. Але калі з усіх бакоў вырастаюць, як грыбы, праваслаўныя храмы, то мне не зразумелая такая актыўнасць. Як быццам нехта збіраецца нешта падкарэктаваць у маім жыцці, а гэта мне не падабаецца. Жаданне хадзіць у гэтыя храмы не нараджаецца. Хутчэй, нараджаецца нейкая доля жадання зайсці ў каталіцкі храм. Менавіта праз тое, што праваслаўе гэтак навязваецца. Усё, што прадзяржаўнае, а тым больш, у справах веры, выглядае не надта прывабна.

**СЯРГЕЙ ХАРЭЎСКІ, МАСТАЦТВАЗНАЎЦА:**

## “ГЭТА НЕНАРМАЛЬНАЯ СІТУАЦЫЯ”

Катэгарычна не. Гэта прафануе сам панятак веры. Гэта дыскрэдытуе саму гэтую царкву ў вачах грамадства. Таму што скласці, проста кажучы, усе яйкі ў адзін кошык, гэта значыць – цалкам узалежніць гэтую канфесію ад ласкі гэтае дзяржавы. Пасля таго, як зменіцца рэжым, я думаю, што выплыве няммала непрыемных і непрыгожых гісторыяў, датычных гэтых узаемадачыненняў. Гэта проста ненармальная сітуацыя, калі грамадства, у якім 90 адсоткаў не верыць у Бога, мусіць лічыцца з гэтай прапагандай. Забытыя правы тых жа атэістаў. Сёння страшна прызнацца, што ты атэіст. Уся гэтая знявага іншых канфесіяў на карысць толькі адной прыводзіць да шматлікіх крыўдаў, і хто ведае, чым гэта адгукнецца ў будучыні? Нават прыўладныя аналітыкі не могуць уявіць сабе сітуацыю змены ўлады. У якім становішчы апынуцца сумленныя святары і шчырыя вернікі? Яны ўсе будуць выглядаць як лукашэнкаўская крэатура. Заўтра ў святароў гэтай царквы спытаюць: чаму вы не далі на роднай мове Святога пісання ў кожны дом? Чаму вы паўсюдна спрыялі гэтаму рэжыму? Як вы маглі дапусціць, што тапталі іншыя канфесіі? Вашых братоў у Хрысце? Навошта вы праваслаўнага атэіста ставіце ў

**Працяг на стар.4**




Еўрапейскі марш "За свабоду" мае адбыцца ў Мінску сёлета 14 кастрычніка. Заяўку аб яго правядзенні днямі падалі ў гарвыканкам прадстаўнікі дэмакратычных сілаў Беларусі. На здымку. Арганізатары маршу (злева направа) Аляксандр Мілінкевіч, Андрэй Саннікаў, Віктар Івашкевіч, Мікола Статкевіч і Анатоль Лябедзька на прэс-канферэнцыі на сядзібе БНФ. Мінск, 14 жніўня 2007 г.

# БЫЛОМУ ФУТБАЛІСТУ ЗБОРНАЙ БЕЛАРУСІ ПАГРАЖАЮЦЬ?

14 жніўня газета "Комсомольская правда" в Новосибирске" апублікавала заяву трэнера тамтэйшай футбольнай каманды Валерыя Шанталосава. У заяве, якая прыйшла ў рэдакцыю праз факс, былы брамнік зборнай Беларусі просіць журналістаў аб дапамозе. Паводле словаў начальніка следчага ўпраўлення ГУУС Мінскага гарвыканкама Генадзя Казакевіча, на якога спасылаецца навасібірская газета, Шанталосаў знаходзіцца ў крымінальным вышуку. Былога галкіпера абвінавачваюць у тым, што ў 2003 годзе ён нібыта падбухторваў гульцоў сваёй каманды прайграць адборачныя матчы зборным Малдовы й Чэхіі з патрэбным лікам.

Гэтую размову запісалі на стужку і занеслі ў беларускую спартовую газету "Прессбол". Успыхнуў скандал, які не аціхае дагэтуль.

Адвакты Шанталосова даводзяць, што ён не мае дачынення да тых падзеяў, але кожны год усплываюць усё новыя доказы. Сам ён лічыць, што супрацоўнікі праваахоўных органаў РБ могуць быць зацікаўленым бокам, таму што беларускім футбольным і міліцэйкім чыноўнікам хочацца паказаць, як яны змагаюцца за чысціню футбола.

Нагадаем, што сёлета зборная Беларусі двойчы саступіла ў адборачным цыкле Чэмпіянату Еўропы зборнай Балгарыі, пры чым на сваім полі – з разгромным лікам. Прадстаўнікі Румыніі, якія таксама выступаюць у адной групе з гэтымі зборнымі, абвінавацілі беларускіх гульцоў у дамоўленасці з балгарамі.

Шанталосаў тым часам даўно ўжо быў у Сібіры.


Заявление.

В связи с необоснованными обвинениями в мой адрес, что подтвердила мой белорусский адвокат Бахтина А. Н., считаю, что возбуждение уголовного дела и вынесение обвинения в мой адрес – это выполнение политического заказа, месть «правоохранительных» органов из ГУБОП РБ, главного редактора газеты «Прессбол» Бережкова В. П. и организатора-исполнителя Тумиловича Г. Н., в связи с чем возникла угроза политической, а в дальнейшем и физической расправы. В течение 2.5 лет я и моя семья подвергаются психологическому воздействию (связанного с потерей здоровья), мне, моей жене и дочери раздавались звонки с угрозами, связанные с этим делом. Помимо этого дочь изгнали из института за свободомыслие, выражение своей позиции и мнения.

Заявляю:

В случае, если со мной либо с моей семьей что-либо произойдет (физическая расправа, повлекшая смерть членов моей семьи), прошу считать виновными вышеперечисленных лиц.

08.08.2007 г. В. Шанталосов

**Факс з заявай** *В. Шанталосава аб тым, што яму пагражае небяспека.*

## Суседзі

# КРЫЖ НА АДЗІНАЙ ВАЛЮЦЕ

Нацыянальны банк Беларусі ў наступным годзе адмовіцца ад «прывязкі» курсу беларускага рубля да расійскага. Гэта прадугледжана праектам асноўных кірункаў грашова-крэдытнай палітыкі на 2008 год, паведамляе «Інтэрфакс».

У якасці адзінага прамежкавага манетарнага арыенціру ў 2008 годзе НББ будзе выкарыстоўваць абменны курс беларускага рубля да даляра ЗША. Пры гэтым у 2008 годзе НББ плануе ўтрымаць абменны курс беларускага рубля да даляра ЗША ў межах плюс-мінус 2,5%.

Намер Беларусі зрабіць арыенцірам для сваёй валюты даляр ЗША замест расійскага рубля гаворыць пра тое, што «канчаткова можна паставіць крыж на ўсіх гутарках пра стварэнне адзінай валюты, што было галоўнай умовай і галоўнай передумовай стварэння рэальнай саюзнай дзяржавы», сказаў у эфіры радыё «Эхо Москвы» прэзідэнт банка «Расійская фінансавая карпарацыя», экс-міністр эканомікі РФ Андрэй Нячаеў.

Беларускі эксперт, Яраслаў Раманчук, каментуючы паведамленні аб планах НББ, сказаў, што «адвязка беларускага рубля ад еўра і расійскага рубля гаворыць пра тое, што Нацбанк пасылае вельмі моцны сігнал з нагоды пагрозы дэвальвацыі беларускага рубля».

Такі крок галоўнай банкаўскай установы, на ягоную думку, абумоўлены тэндэнцыямі на міжнародным валютным рынку, дзе даляр цягам параўнальна доўгага часу абясцэньваецца ў дачыненні да асноўных сусветных валют, у тым ліку і да расійскага рубля. Між іншым, курс беларускага рубля да даляра ЗША з пачатку 2007 года панізіўся на 0,2%, у той час як у дачыненні да курсу еўра паніжэнне склала 4,4%, а да расійскага рубля – 3,5%.

**Паводле СМІ**

# КАРОЛЬ ПАЛЁЎ

## ПАСЛЯ ЦЫБУЛІ ЎЗЯЛІСЯ ЗА КУКУРУЗУ

Працяг са стар.1

Да таго ж, палітыка Лукашэнкі датычна сельскай гаспадаркі (і не толькі яе) вельмі супярэчлівая. Нават у дробязях. Падчас вышэйзгаданай паездкі па Гродзеншчыне кіраўнік Беларусі заклікаў адмовіцца ад неабгрунтаваных выдаткаў. І праз дзве хвіліны запатрабаваў ствараць і распаўсюдзіць буклеты ды іншую друкаваную прадукцыю пра аграгарадкі.

І што далей? Раздаваць іх калгасным алкаголікам? Ці агітаваць фермераў з Захаду за перавагі нашага аграгарадковага ладу? Дык не: нават Лукашэнка прызнае, што там справы лепей, чым у нас. Праглядаючы трансляцыю з велагонкі “Тур дэ Франс”, кіраўнік Беларусі заўважыў, што палі са збожжавымі культурамі ў Францыі значна лепш дагледжаныя, чым у нас. І як гэта ў французаў атрымліваецца – без селектарных нарадаў і загадаў зверху што й дзе садзіць?

Яшчэ адным анекдотам стаў загад на пашырэнне плантацыяў кукурузы ў Беларусі. З дапамогай гэтай культуры, як вядома, збіраўся ўзняць савецкую сельскую гаспадарку яшчэ Мікіта Хрушчоў. Некаторы час усе газеты выходзілі з шапкамі: “Кукуруза – каралева палёў”. Паколькі Савецкі Саюз – не Амерыка (у тым ліку, у кліматычных адносінах), з паўсюдным вырошчваннем каштоўнай культуры нічога не атрымалася. Аднак, нам трэба абавязкова паспытаць гэтыя грэблі на ўласным ілбе.

Чым гэтая кампанія скончыцца, ужо вядома. Пару гадоў таму Лукашэнка патрабаваў, каб калгасы і саўгасы рэзка павялічылі вытворчасць цыбулі ды гароху. Гэта было абвешчана ледзь не прыярытэтам дзяржаўнай палітыкі. І што? Ці чуў хто пра нейкія поспехі ў гэтым накірунку? Пра гэта нават “Советская Белоруссия” лічыць за лепшае не згадваць. Той самы лёс чакае і кукурузу.

Час, калі ад падтрымкі стратных сельгаспрадпрыемстваў давядзецца адмаўляцца, непазбежна прыйдзе. Аднак дагэтуль улады паспеюць змарнаваць яшчэ шмат грошай. Якія, між іншым, бяруцца не з паветра, а з кішэняў падаткаплатнікаў. Потым мы будзем хапацца за галовы: як можна было змарнаваць столькі грошай на аграгарадкі ды іншае глупства? Але сёння амаль нікога гэтае пытанне моцна не цікавіць. Бо ёсць правадыр. А мы – ні пры чым.

**Валеры Філін**

# ЦІ НА КАРЫСЦЬ БЕЛАРУСІ ПРЫЯРЫТЭТНАЕ Ў АДНОСІНАХ ДА ІНШЫХ КАНФЕСІЙ СТАНОВІШЧА РУСКАЙ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ?

Працяг са стар.2

сябе на амбоне на свята? Як гэта назваць? А калі глядзець з юрыдычнага пункту гледжання, я думаю, што пракуратуры пасля будзе цікава разабрацца з аплатай падаткаў, з выкарыстаннем маёмасці. Сёння гэта абсалютна бескантрольна.

**УЛАДЗІМІР, НАСТАЎНІК:**

### “БАЧУ ТОЛЬКІ АГРЭСІЮ”

Якая карысць? Вы што, не бачыце, у што ператвараеца РПЦ? Асабіста я бачу, як у нетрах гэтае царквы выспеў люты вялікадзяржаўны расійскі шавінізм. Яны перасталі баяцца крытыкі. Яны не зважаюць на нашу нацыянальную годнасць. Перабудоўваюць помнікі нашай старасветчыны, будуюць што заўгодна на тэрыторыях сваіх. Вешаюць выявы Мікалая II-га, дзе ім захочацца. Яшчэ крыху, і РПЦ ператворыцца ў рупар чарнасоценства. Зайдзіце ў любую царкоўную лаўку і знайдзіце хоць адну паперку па-беларуску. Затое ёсць цэлая плойма манархічнай вялікадзяржаўнай мукулатуры. Гэтая царква займаецца не ратаваннем душаў ці асветніцтвам, а імперскай прапагандай. Дзякуючы гэтай прыярытэтнасці РПЦ загнала сябе ў той лагер, дзе ўсё жывое і беларускае нішчыцца. Падкажыце, у якім храме ёсць прыязнасць да беларускага слова? Я бачу толькі агрэсію.

**ВАЛЯНЦІН АКУДОВІЧ, КУЛЬТУРОЛАГ:**

### “ТРЭБА ЗНАЙСЦІ ГАРМОНІЮ”

Не на карысць. Засілле і дамінацыя Рускай праваслаўнай царквы ламае ўнутраны лад Беларусі як шматкафесійнай прасторы. Беларусь і склалася як Беларусь таму, што тут у розныя часы ў розных прапорцыях прысутнічалі і знайшлі мірную форму суіснавання самыя розныя канфесіі і рэлігіі. Я не думаю, што на карысць было і дамінаванне ў сваю пару каталіцызму. І калі землі Беларусі патрапілі ў склад Расійскай імперыі і адбылося татальнае рэпрэсаванне каталіцызму і ўніяцтва, апошняе было вынішчана, то праз гэта змянілася ўнутраная сутнасць Беларусі. Сама Беларусь і ўсе яе жыхары сталі іншымі. І таму, калі мы думаем пра еўрапейскі выбар, трэба было б знайсці тую раўнавагу, тую канструктыўную праўду, калі заўгодна, тых канфесій і рэлігій, якія ляжаць у аснове Беларусі як цэлага. Мы найперш звязваем Беларусь з мовай, з гісторыяй, з нацыянальнай культурай. Але я думаю, што ў аснове Беларусі, той сапраўднай Беларусі, якая павінна была быць, якая фармавалася, ляжыць вось гэтая форма гарманічнага суіснавання канфесій без выразнай дамінацыі. І як толькі гэтая гарманічная форма зламалася, дык усё пайшло ў дэструкцыю. Хоць я не вялікі вернік, але я цудоўна разумею – каб вярнуць Беларусі яе цэласнасць, сістэмнасць і яе праўду, трэба знайсці ізноў гэтую гармонію рэлігіяў і веравызнанняў. Яны стварылі Беларусь такой, якая яна ёсць, яе адметнасць. Вярнуўшы гэта, мы шмат чаго дасягнем у стварэнні супольнасці грамадзянскай і нацыянальнай. Дамінаванне і розныя формы дзяржаўнай падтрымкі праваслаўя – гэта, па вялікім рахунку, згуба для Беларусі. Ператварэнне Беларусі ў праваслаўную краіну – гэта наша бяда. І гэтага мы павінны засцерагацца. Як і ператварэння ў каталіцкую ці пратэстанцкую дзяржаву.

# ЧАВЕС ВУЧЫЦЦА Ў ЛУКАШЭНКІ

15 жніўня прэзідэнт Венесуэлы Уга Чавес выступіў перад Нацыянальным Сходам краіны з прапановамі аб змене канстытуцыі. Канстытуцыйная рэформа павінна адмяніць абмежаванні на колькасць прэзідэнцкіх тэрмінаў і дазволіць Чавесу знаходзіцца пры ўладзе неабмежавана доўга. Будуць таксама ўведзены змены, якія абмяжуюць уладу губернатараў штатаў і мэраў гарадоў – ім якраз будзе забаронена заставацца ва ўладзе неабмежавана доўга.

Цяперашні тэрмін Чавеса ва ўладзе заканчваецца у 2012 годзе. Адзін з міністраў Чавеса заявіў, што мэта зменаў – “гарантаваць людзям найбольшую колькасць магчымага шчасця”.




belzhaba.com

## ХТО СУПРАЦЬ? КАТАЛІЦКАЯ ЦАРКВА І СТУДЭНТЫ

Чавес выступіў са сваімі прапановамі перад Нацыянальным Сходам, усе 167 дэпутатаў якога падтрымліваюць яго палітыку. Прыхільнікі Чавеса таксама кіруюць Вярхоўным Судом, усёй федэральнай бюракратыяй, дзяржаўнай нафтавай кампаніяй і ўсімі венесуэльскімі штатамі, за выключэннем двух.

Менавіта губернатар аднаго з гэтых штатаў – штату Зуліа – Мануэль Расалес з’яўляецца найбольш аўтарытэтным праціўнікам Чавеса. Расалес набраў на прэзідэнцкіх выбарах у снежні 2006 году каля 40 працэнтаў галасоў. Сам Чавес, як вядома, атрымаў каля 60-ці.

Аналітыкі звяртаюць увагу і на некаторыя няўдачы Чавеса. Калі ён нядаўна паспрабаваў забараніць прыватны тэлевізійны канал, то сутыкнуўся са студэнцкімі пратэстамі па ўсёй краіне.

Каталіцкая царква Венесуэлы рэзка скрытыкавала прапановы аб працягу паўнамоцтваў Чавеса. Кардынал Расаліё Хасэ Кастыллё Ляра назваў Уга Чавеса “паранаідальным дыктатарам”.

## ЯШЧЭ “20 ГАДОЎ ВА ЎЛАДЗЕ?”

Сам Чавес нядаўна заявіў, што “людзям Венесуэлы трэба даць права трымаць прэзідэнта ва ўладзе столькі, колькі ім падабаецца – незалежна ад таго, будзе гэта 5, 12 або 40 гадоў”.

Праграма і погляды Уга Чавеса маюць сацыялістычны ўхіл. Ён актыўна выкарыстоўвае тэрміны “рэвалюцыя” і “контррэвалюцыя” і з’яўляецца прыхільнікам дзяржаўнага кіравання эканомікай.

Падчас апошняга візіту ў Мінск у чэрвені сёлета Уга Чавес сказаў перад тэлекамерамі Аляксандру Лукашэнку: “Калі мы за год столькі зрабілі, то колькі зробім за тыя 20 гадоў, якія нам яшчэ заставацца ва ўладзе”.

У 2005 годзе Аляксандр Лукашэнка правёў рэферэндум, у выніку якога ў Беларусі былі скасаваныя абмежаванні на колькасць прэзідэнцкіх тэрмінаў для аднаго чалавека.

**Паводле Радыё Свабода**

# РАБАЛЕПСТВА НЕ ДАПАМАГЛО

## Наша пошта

Газета «Звязда» у пачатку 90-х выглядала даволі дэмакратычна. Тут бывалі і Шушкевіч, і Пазьняк, і нават спадар Лукашэнка. Пасля прыходу апошняга да ўлады ў рэдакцыю завітваў і спадар Фядута, які прапаноўваў газеце стаць прэзідэнцкай. «Параімся з калектывам»,— быў яму тады адказ галоўнага рэдактара Ул. Наркевіча.

Калектыў звяздоўцаў выказаўся супраць. І тады грошы, і «бацькава» падтрымка паплылі ў «Советскую Белоруссию», а «Звязда» трапіла ў апалу. Але ці была тая апала? І ці ёсць яна цяпер?

Маладыя журналісты не паднялі ў газеце ніводнай




праблемы з тых, якімі жыве грамадства, б’юць чалом Лукашэнку (хаця і пад псеўданімамі). Беларускага духу ў газеце няма. Гэта бачна і па старонках «Звязды», якія поўняцца элементарнымі факталагічнымі і граматычнымі памылкамі. Зніклі з іх праблемы культуры, захавання спадчыны, мовы. Падлічана, што па колькасці змешчаных партрэтаў Лукашэнкі газета намнога апярэджвае «Советскую Белоруссию». (Дарэчы, галоўны рэдактара “СБ” Павел Якубовіч павіншаваў калег з 90-годдзем з вялікім спазненнем.)

Свой юбілей калектыў, як і належыць журналістам абслугі, адзначыў п’янкай за прафсаюзны кошт. Кажуць, перад тым былі падзеленыя ўзнагароды, якія кіраўнік дзяржавы, Палата прадстаўнікоў і ўрадавыя ўстановы будуць уручаць толькі праз месяц. Якія фармулёўкі будуць гучаць пры ўручэнні ўзнагародаў — цяжка сказаць. Наклад газеты за апошнія гады знізіўся да непрыстойнасці, фінансавы стан — крытычны. Калі ўлічыць знікненне беларускамоўнай газеты «Чырвоная змена» і практычнае спыненне выхаду часопіса «Беларуская думка», дык, магчыма, ліквідацыя чакае і «Звязду». Кваліфікаванае вынішчэнне беларускасці працягваецца.

**Сяргей Бовін**

# КАЛІ ЗАЎТРА ВАЙНА

Саюздрук

## АЛЬБО ЗАВІЦЕ МЯНЕ ПРОСТА — САІД

У каментары з нагоды газавага канфлікту Беларусі і Расіі галоўны рэдактар газеты "7 дней" Чыкін ужо не абмяжоўваецца абвінавачаннямі на адрас абстрактнага расійскага кіраўніцтва. Зрываць маскі, дык зрываць:

*«Убежден, что и идею построения Союзного государства хоронить рано. Ведь Путины, как говорится, приходят и уходят... Впрочем, и самому Владимиру Владимировичу не позавидуешь. Если в XXI веке он пытается удушить две сестры-республики — Украину и Беларусь, то в XI веке Туровский князь Святополк Владимирович не менее жестоко расправился со своими братьями Борисом и Глебом. Прошла тысяча лет, но братоубийцу до сих пор помнят под именем Святополка Окаянного. Интересно, как будут называть Владимира Владимировича историки третьего тысячелетия?"*

З чаго б такая істэрыка? Я не ведаю, як будуць называць Пуціна ў трэцім тысячагоддзі, а вось сённяшняму кіраўніцтву Беларусі можна смела яго называць выратавальнікам. Бо хто яшчэ падорыць такую "палочку-выручалочку" для будучага дыялогу з родным электаратам. Ва ўсіх заўтрашніх бедах, ува ўсіх крызісах і праблемах будзе абвінавачвацца хцівая імперская Расія і асабіста Пуцін.

Сёлета Мінску 940 гадоў. Па ім гэтага, праўда, не скажаш. Савецкія начальнікі працавалі ў плане горадабудаўніцтва так плённа, што хоць прыбірай лічбу "9" з юбілейнай даты. У сувязі з круглай датай газета "Рэспубліка" сабрала круглы стол на тэму, якой быць нашай сталіцы заўтра. Вось што сказаў Васіль Абламскі, начальнік Упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Беларусі:

*"Конечно, иногда мы вынуждены уходить «на подделку», потому что старых аутентичных зданий у нас фактически не осталось. И те исторические данные, которые мы имеем, сегодня дополняются, чтобы воссоздать объект и дать ему возможность функционировать. Грубо говоря, чтобы не был мертвым город. Но всегда перед тем как приступать к проектированию таких объектов, все виды работ согласовываются с Министерством культуры. Проектные предложения по реконструкции зданий по улице Кирилла и Мефодия № 6 и № 8 рассматривались и были одобрены республиканским методическим советом. Но среди общественности уже поднят шум по поводу дальнейшей судьбы этих зданий, волнуются о том, как они будут использоваться."*

Будынкі, якія Абламскі сарамліва называе №6 і 8, гэта комплекс кляштара Бернардынцаў. Тое нямногае, да чаго яшчэ не дабраліся гаспадарлівыя рукі чыноўнікаў і алігархаў мясцовага разліву, і дзе яны плануюць зрабіць гатэль з падземным паркінгам і басейнам. Я нават не сумняваюся, што той басейн будзе збудаваны. Мне нашчадкаў шкада. Што будзе з Мінскам у 2067-м годзе? Калі сталіцы споўніца 1000 гадоў? Ці будзе сэнс пакідаць у той лічбе адзінку?

А "Звязда" піша пра прыезд у Беларусь спартоўца з Арабскіх Эміратаў, спадчыннага прынца Саіда Бін аль-Мактума. Зрэшты, дзеяслоў "піша" тут не надаецца. "Звязда" ўкленчвае і падае ніцма.

*"Яго называюць па-рознаму: хто — наследным прынцам, хто — шэйхам, а хто — проста Саідам. Дый ён сам, калі чэсна, чалавек просты, пра якога гавораць «свой у дошку». Нават мільярды долараў ніяк не паўплывалі на яго характар. А ён жа, калі задумацца, можа абсалютна ўсё.*

*Для Беларусі прыезд Саіда Бін аль-Мактума — свайго роду сенсацыя. Не кожны ж дзень да нас у госці наведваюцца наследныя прынцы з Арабскіх Эміратаў, ды яшчэ з такой вялікай світай: камандай спартсменаў, асабістым трэнерам, целаахоўнікам з Італіі, прэс-сакратаром, вадзіцелямі, рознымі памочнікамі і сваімі кухарамі. У Мінск ён прыехаў для ўдзелу ў Кубку Беларусі па стэндавай стральбе.*

*Я ўпершыню адчула два пачуцці — шок і захапленне. За метр ад мяне спакойна разгульвае шэйх з ружжом на плячы, зусім не думаючы аб уласнай бяспецы. (…)".*

Пра што думаў прынц, здагадацца не цяжка. "Алах акбар, куды я патрапіў? І што хоча ад мяне гэтая апантаная дзяўчына з нататнікам?" Хоць, насамрэч, усё гэта вельмі сумна. Што да нас не ездзяць першыя асобы Еўропы і Амерыкі. Што цэнтральная газета выглядае на заштатную раёнку. І што большасць насельніцтва шчыра лічыць, што ўсё гэта нармальна.

**Алесь Канюціч**

# МАРШ У ЕЎРОПУ

Як робяцца хвалі

## АБО ПРЫ ЧЫМ ТУТ КРЫМІНАЛЬНЫ ШАНСОН?

Апазіцыя дэкларуе лозунг "Беларусь у Еўропу" і рыхтуе Еўрапейскі марш у Мінску 14 кастрычніка. (Праўда, калі мне не здраджвае памяць, накірунак ад Цэнтральнай плошчы да Нацыянальнай бібліятэкі вядзе ў бок Масквы.) Але фокус у тым, што ўжо даўным-даўно існуе Еўрапейская альбо Заходняя Беларусь. Маю на ўвазе Беласточчыну, Віленшчыну, Дзвіншчыну. Гэтыя землі, населеныя беларусамі, ужо некалькі гадоў знаходзяцца ў Еўрапейскім саюзе. Ці скарысталі тамтэйшыя беларусы ўсе выгоды Еўрапейскай цывілізацыі? На жаль, гэтая тэма амаль не прысутная ў нашых СМІ. Напрыклад, на Віленшчыне маюць сваіх карэспандэнтаў і Свабода, і Палонія, і Рацыя. Але навіны і аналіз падзеяў адтуль гучаць вельмі рэдка, галоўным чынам, калі адбываецца якаясь міждзяржаўная беларуска-літоўская падзея. Дык вось, мая прапанова такая – няхай бы рэдакцыі нашых незалежных радыёстанцый распачалі адмысловы праект "Заходняя Беларусь" і далі сваім карэспандэнтам ды аналітыкам больш часу, каб яны распавялі пра тамтэйшых еўрапейскіх беларусаў.

15 жніўня "Акно ў Еўропу" на Еўрарадыё паведаміла ў навінах, што застаўся ў сіле прысуд нейкаму спеваку, што праславіўся крымінальнымі рускамоўнымі песенькамі. І гэтыя навіны пра суд над тым няшчасным спеваком рэгулярна гучалі на розных станцыях недзе каля паўгода. Як быццам наняліся рабіць яму рэкламную кампанію. Калі ён засуджаны несправядліва, то чаму пра яго нічога не гавораць праваабаронцы і аналітыкі? Хай мне дарue той музыка, калі я не маю рацыі, але здаецца, што гэта звычайная рэкламная кампанія. І на здароўе. Але пры чым тут свабоднае беларускае радыё?

На Радыё Рацыя кожны дзень выходзіць рубрыка "Каляндар". Спачатку называецца год, а потым гаворыцца пра нейкую падзею альбо чалавека. Гэткі парадак падачы матэрыялу добры для пісьмовага тэксту. У вуснага маўлення свае законы. Тут немагчыма вярнуцца назад – у якім жа годзе адбылося тое ці тое? Я прапаную спачатку называць, што адбылося, а калі слухача гэты факт зацікавіць, дык ён тады ўжо натапырыць вуха і пастараецца запомніць тую дату і не заблытацца ў шэрагу названых лічбаў.

**Сяржук Вітушка**

# ПРАКЛЯТЫЯ ПАЭТЫ

Стрэмкі

## ЧАМУ ВЫСОКІ ДАР ДАЕЦЦА СЛАБЫМ?

Далі пачытаць стары нумар "Калосься" (1-2006). Ужо больш за месяц мінула, а ўсё круцяцца ў галаве думкі ад прачытанага. Як надакучлівыя мухі. А мо – восы?

Нумар прысвечаны трагічным лёсам паэтаў – Сыс, Купрэеў, Гадулька, Рубін. Усе яны заўчасна пайшлі з жыцця – хто спіўся, хто наклаў на сябе рукі... (Усе, бо хоць Мікола Купрэеў фармальна пражыў досыць доўга – але ці было гэтае існаванне жыццём?)

Пытанне, якое мучыла пушкінскага Сальеры – чаму высокі дар Нябёсаў дастаецца слабым і нікчэмным людзям? А няхай бы гэта была ўзнагарода за выдатную вучобу і прыкладныя паводзіны! А то – вершы будуць "праходзіць" у школе, а вось біяграфіі аўтараў, як прыклад "делать жизнь с кого" – не.

Варлам Шаламаў, прачытаўшы "Адзін дзень Івана Дзянісавіча", быў абураны: што гэта за лагер такі, дзе ўсе мелі лыжкі? У нашым баланду пілі цераз край! Чаму ходзіць кот? У нашым даўно б з'елі... і гэтак далей. "З'явіўся яшчэ адзін "лакіроўшчык рэчаіснасці" – рабіў выснову Шаламаў.

І вось гэтыя людзі, што прайшлі зямное пекла, непараўнальнае з дантаўскім, — не зламаліся. Ні Шаламаў, ні Салжаніцын, ані нашыя Ларыса Геніюш ці Лявон Луцкевіч. Дык што ж за беды такія, якія пакуты сагнулі нашых паэтаў у барані рог? Ніводзін не зазнаў турэмных нараў, проч выцвярэзніка. Ніхто не быў скалечаны, не страціў зрок, не аглух...

"... калі Сыс атрымаў кватэру", — не зарабляючы і не пазычаючы грошы, не беручы крэдыту – атрымаў, як кветачку ў дзень народзін. Купрэеў – таксама. Не ў карцэры-адзіночцы пісалі вершы, а ў аднапакаёўцы з ваннаю і цёплым клазетам. Во які здзек рэжыму!

Купрэеў, праўда, пераўжыў сапраўдную трагедыю – Дзяржаўнай прэміі не далі. Як жа тут не спіцца з гора...

І ўсё роўна – калі чалавек губіць сябе, гэта заўсёды драма. Якім бы гэты чалавек ні быў.

Часта цытуюць Пушкіна – як той абураўся, што публіка любіць смакаваць жыццяпісы творцаў – маўляў, "он так же мал и мерзок, как мы!". Не, "мал и мерзок – но не так, как вы!" – пярэчыць паэт.

У тым і бяда, што – так. Бомж-паэт смярдзіць гэтаксама, як любы іншы. Ці пакрыўдзіць цябе паэт, ці бухгалтар – усё роўна баліць. Толькі крыўда з боку паэта – горшая, бо ад яго чакаеш "разумнага, добрага, вечнага".

Так бы хацелася, каб творцы нашых любімых вершаў і фільмаў былі белымі і пушыстымі, так хацелася б любіць аўтараў – як людзей. А яны найчасцей злыя, калючыя і кепска пахнуць.

Леў Талстой тлумачыў гэта так – мастак бярэ з сябе ўсё лепшае і ўкладвае ў сваё творы, таму яны "прекрасны, а жизнь его дурна".

Мастак – і такі, і не такі як усе. Як і ў кожным, у ім гняздзіцца цэлы звярынец – не толькі белыя рахманыя галубкі, але й брудныя гіены. І не заўсёды ён мае ўладу над імі.

Але прыгажосць праходзіць на гэты свет праз яго.

І не ў нашай моцы накіроўваць яе шляхі.

Быў бы творца з "іншага цеста" – як бы ён перадаў і выказаў тое, што робіцца з намі? Калі б не спазнаў усё на ўласнай скуры – гора і радасць, грэх і раскаянне?

Творца не можа пражыць жыццё, не пакрыўдзіўшы нікога. Многіх ён зневажае самім фактам свайго існавання. Тым, што пастаянна рвецца на волю – нават ад тых, хто яго ўсім сэрцам любіць.

Нельга апраўдаць брудныя ўчынкі паэта.

Але іх можна – прабачыць.

Няшчасны чалавек, якога пакрыўдзілі. Але той, хто няздольны прабачыць, — няшчасны ўдвая.

Жыццё кожнага чалавека – драма. Але драма паэта – падвойная. Бо ён жыве падвойным жыццём – зямным і нябесным.

Аднак на судзе над Паэтам у першую чаргу разглядаюцца яго песні. І кепскі верш для паэта – грэх нашмат большы, чым няшлюбнае дзіця.

Паэт як асоба – наносіць раны.

Паэт як творца – раны гоіць.

Будзьма ж удзячнымі – нягледзячы ні на што.

**Алег Аблажэй**

## Фотафакт



**Старыя чыгуначныя** *вагоны выкарыстоўваюцца Рускай праваслаўнай царквой у мясцінах, дзе няма храмаў, для набажэнстваў. Віцебская вобласць, ліпень 2007 году.*

# Невядомая Беларусь

**16 жніўня** 1945 году, згодна з дамовай паміж СССР і Польшчай, ад Беларусі да Польшчы адышла амаль уся Беластоцкая вобласць у складзе 17 раёнаў з абласным цэнтрам і 3 раёны Брэсцкай вобласці. У межах польскай дзяржавы апынулася значная колькасць беларускага насельніцтва. Цяпер беларусы ў Польшчы – адна з самых вялікіх нацыянальных меншасцяў.

**19 жніўня** 1587 году ў сярэднявечнай Беларусі адбылася змена кіраўніка краіны. Вялікім князем быў абвешчаны Жыгімонт Ваза. Перад тым ён быў прагнаны са шведскага пасаду тамтэйшымі пратэстантамі. У беларускую гісторыю Жыгімонт Ваза ўвайшоў тым, што садзейнічаў Брэсцкай царкоўнай уніі і адваяваў у Масковіі Смаленшчыну.

**20 жніўня** 1937 году ў Саратаве быў арыштаваны неадменны сакратар Беларускай Акадэміі Навук Вацлаў Ластоўскі. Сёмы год гэты пачынальнік нацыянальнага адраджэння і навуковец адбываў ссылку ў расійскай глыбінцы. Гэтым разам праз некалькі месяцаў утрымання ў саратаўскай турме яго расстраляюць.

**21 жніўня** 1941 году ў Мінску была створана Беларуская Незалежніцкая Партыя. Зміцер Касмовіч згадвае, што ў той дзень некалькі патрыятычна настроеных супрацоўнікаў акупацыйнай адміністрацыі, сабраўшыся на прыватнай кватэры, абмеркавалі палітычную сітуацыю ў краіне і зрабілі наступныя высновы: «Мэта Гітлера ёсць каланізацыя і паняволенне Беларусі; Беларускі народ павінен выкарыстаць вайну для сваёй мэты – аднаўлення вольнай беларускай дзяржавы. Для ажыццяўлення гэтай мэты патрэбная беларуская збройная сіла». Ворагам нумар адзін падпольшчыкі назвалі бальшавіцкую Маскву, ворагам нумар два – нацысцкую Германію.

# ШАНОЎНЫ ЧЫТАЧ!

*Для таго, каб наша з вамі газета станавілася лепшай і яе было цікавей чытаць, нам трэба больш ведаць пра вас. І ўлічваць ваша меркаванне.*

*Таму мы прапануем вам адказаць на пытанні нашай анкеты, якая друкуецца ніжэй. Вам не трэба называць сваё прозвішча і дакладны адрас – дастаткова запоўніць анкету, выразаць яе і даслаць на адрас: 220050 МІНСК, а/с 97*

1. **Пазначце свой узрост, адукацыю, род заняткаў**

2. **Дзе Вы жывяце – у вёсцы, у мястэчку, у горадзе?** *(Патрэбнае падкрэсліць.)*

**3. Як Вы атрымліваеце газету:** *па падпісцы, у цягніку, на рынку, праз паштовую скрыню?*

4. **Як часта вы атрымліваеце "Свабоду":** *кожны тыдзень, некалькі разоў на месяц, раз на месяц, радзей чым раз на месяц...?*

**5. Якая тэматыка цікавіць Вас найбольш? (патрэбнае падкрэсліць):** *грамадска-палітычная; сацыяльна-эканамічная; міжнародная; культурніцкая; гістарычная; іншая?*

**6. Матэрыялы якіх рубрык выклікаюць Вашу ўвагу найперш**?
- *Пытанне тыдня і Каментар*
- *Чаго не паказвае БТ*
- *Суседзі*
- *Грамадства і ўлада*
- *Беларусь-Расія*
- *Беларусь-Еўропа*
- *Гаспадарка*
- *Саюздрук*
- *Як робяцца хвалі*
- *Стрэмкі*
- *Невядомая Беларусь*
- *Блакітны агеньчык*
- *Наша пошта*
- *Фотафакт*
- *Мясцовы дадатак*

(Можна пазначыць птушкай адразу некалькі рубрык)

**7. Якія рубрыкі Вы лічыце нецікавымі ці непатрэбнымі?**
*(Напішыце)*

**8. Якіх рубрык, на Вашу думку, не хапае ў газеце?**
*(Напішыце)*

**9. Ці падабаецца Вам афармленне газеты (памер і колькасць старонак, шрыфты, загалоўкі, размяшчэнне матэрыялаў на паласе, колькасць і якасць ілюстрацый)?** *(Напішыце, што канкрэтна Вам падабаецца ці не падабаецца)*

**10. Ці жадалі б вы, каб накірунак рэдакцыі "Свабоды":**
- *заставаўся гэткім самым;*
- *быў больш нейтральным;*
- *быў больш апазіцыйна скіраваным (пазначце).*

**11. Ці ёсць у вас якія-небудзь іншыя каментары ці рэкамендацыі да нас?**

**Поспехаў вам!**
**Чакаем вашых адказаў.**

КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ АТРЫМЛІВАЦЬ СВАБОДУ ПРАЗ ПОШТУ, ДАШЛІЦЕ ВАШ ПОЎНЫ І ДАКЛАДНЫ АДРАС (ІНДЭКС, ГОРАД, ВУЛІЦА, ДОМ І КВАТЭРА) SMS-ПАВЕДАМЛЕННЕМ НА НУМАР +370 687 42185 АЛЬБО НА E-MAIL: EDIT@VILNIA.COM
КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ ЧЫТАЦЬ СВАБОДУ Ў ІНТЭРНЭЦЕ І Ў PDF-ВЕРСІІ, ЗАХОДЗЬЦЕ НА САЙТ WWW.VILNIA.COM
КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ АТРЫМЛІВАЦЬ PDF-ВЕРСІЮ СВАБОДЫ, ПАВЕДАМЦЕ НАМ НА E-MAIL EDIT@VILNIA.COM ВАШ ЭЛЕКТРОННЫ АДРАС.

**Заснавальнік** ТАА "Тут і цяпер" **Тыраж** 299 экзэмпляраў
**Галоўны рэдактор** А. Уласаў (email: edit@vilnia.com) **Падпісана ў друк** 15.08.2007 00:54
**Адрас** 220013 г. Мінск, пл.Каліноўскага 1а